Уладзімір Анатольевіч Шабан

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Уладзімір Анатольевіч Шабан (нар. 4 красавіка 1958, Любань, Вілейскі раён, Мінская вобласць) — беларускі ваеннакамандуючы, палкоўнік, дырэктар Беларускага дзяржаўнага цырка (з 2013).

Уладзімір Анатольевіч Шабан	
Род дзейнасці	ваенны
Дата нараджэння	4 красавіка 1958 (65 гадоў)
Месца нараджэння	Любань, Каловіцкі сельсавет, Вілейскі раён, Мінская вобласць, БССР, СССР
Месца працы	Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Беларуская дзяржаўная філармонія Беларускі дзяржаўны цырк
Альма-матар	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (1982)
Партыя	Рэспубліканская партыя
Узнагароды і прэміі	

Біяграфія

Нарадзіўся 4 красавіка 1958 года ў в. Любань Вілейскага раёна Мінскай вобласці[1]. Скончыў музычную школу па класе баяна[2].

Служыў ва Узброеных сілах СССР у горадзе Гатчына Ленінградскай вобласці ў воінскай часці, якая адносілася да Камітэта дзяржбяспекі СССР[3].

Пасля службы ў войску ў 1982 годзе скончыў Мінскі інстытут культуры. Спецыяльнасць па адукацыі: культасветработнік, арганізатар-метадыст клубнай работы[4].

Пасля заканчэння ВНУ быў накіраваны на працу ў органы дзяржаўнай бяспекі, дзе праслужыў 30 гадоў. Пачынаў працаваць у Самаркандзе Узбекскай ССР, дзе працаваў на працягу 12 гадоў[5].

У 1981 годзе ажаніўся, у 1983 годзе ў сям'і нарадзілася дачка, а ў 1992 годзе — сын[5].

У 2000 годзе працаваў начальнікам аддзела па абароне канстытуцыйнага ладу і барацьбе з тэрарызмам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па г. Мінску і Мінскай вобласці[6]. Скончыў службу ў КДБ на пасадзе намесніка начальніка ўпраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці[7].

З 2010 па 2013 гады працаваў намеснікам генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце, сацыяльных, прававых і кадравых пытаннях Беларускай дзяржаўнай філармоніі[8].

5 снежня 2013 года прызначаны дырэктарам Беларускага дзяржаўнага цырка[8].

Член Рэспубліканскай партыі[9].

Узнагароды

- медаль «За бездакорную службу» III ступені (1990)[4]
- медаль «За бездакорную службу» II ступені (2000)[6]
- медаль «За бездакорную службу» I ступені (2005)[4]

Зноскі

1. Лобатый Станислав. «Теперь целую клоуна в темечко» // Сельская газета № 2015-15 от 7 февраля 2015 (http://belsmi.by/archive/article/11085) Архівавана (https://web.archive.org/web/20221204123225/http://belsmi.by/archive/article/11085) 4 снежня 2022.
2. Сілавікі ў беларускай культуры: з КДБ — у цырк, з міліцыі — на БТ (https://euroradio.pl/silaviki-u-belaruskay-kultury-z-kdb-u-cyrk-z-milicyi-na-bt)
3. Глаза в глаза. Директор Белгосцирка Владимир Шабан (https://minsknews.by/glaza-v-glaza-direktor-belgostsirka-vladimir-shaban/)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20200925080116/https://minsknews.by/glaza-v-glaza-direktor-belgostsirka-vladimir-shaban/) 25 верасня 2020.
4. Владимир Шабан. Санкт-Петербургский международный культурный форум (https://culturalforum.ru/participants/vladimir-shaban)

5. Директор Белгосцирка Владимир Шабан: первый международный фестиваль циркачей соберет звезд со всех континентов (https://www.sb.by/articles/fokusy-nashego-tsirka.html)
6. Указ Президента Республики Беларусь от 29 августа 2000 года № 467 «Аб узнагароджанні групы ваеннаслужачых, асоб начальніцкага складу органаў унутраных спраў і прыраўнаваных да іх асоб медалём „За бездакорную службу“ I, II, III ступені» (http://pravo.levonevsky.org/bazaby09/sbor56/text56997.htm)
7. Хроника нарушений прав человека в Республике Беларусь (https://bydc.info/images/news/kto_stoit_za_ischeznovenijami_politikov.pdf) (недаступная спасылка)
8. У Белдзяржцырку — новыя дырэктар і мастацкі кіраўнік (https://by.belapan.by/archive/2013/12/12/668451_668483/) (недаступная спасылка)
9. Решение Президиума Минского городского Совета депутатов от 9 июля 2012 года № 28/2207 «Об образовании окружных избирательных комиссий по выборам депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва» (https://minsk.gov.by/ru/actual/view/408/sostav_komisii.shtml) Архівавана (https://web.archive.org/web/20210625081113/https://minsk.gov.by/ru/actual/view/408/sostav_komisii.shtml) 25 чэрвеня 2021.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Уладзімір_Анатольевіч_Шабан&oldid=4486679"